Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 18 (296) | ПАНЯДЗЕЛАК, 24 чэрвеня 1957 г. | Цана 20 кап.

Эма Хількевіч і Таіса Якубёнак рыхтуюцца да чарговага экзамена па квантавай механіцы. Фота М. ПІЛЬШЧЫКАВА.

ЦЯЖКА НА СЕМІНАРАХ—ЛЁГКА НА ЭКЗАМЕНАХ

Экзамен па гісторыі КПСС на I курсе рускага аддзялення пацвердзіў, наколькі правільным было тое, што студэнтаў сталі арыентаваць на вывучэнне першакрыніц, а не каментарыяў да іх.

Старанная падрыхтоўка да практычных заняткаў, удумлівая праца над творамі марксізма-ленінізма, «пяцімінуткі» — агляд падзей за тыдзень, якія праводзіліся перад кожным семінарам, не прайшлі дарам. Грунтоўныя, трывалыя веды паказалі многія студэнты. Пры адказе яны маглі звязаць тэорыю з практычным сучасным жыццём.

Нельга не сказаць аб студэнтках Пракудовіч і Самуйлёнак. Яны нахваталіся толькі вярхоў з вывучаемага матэрыялу. Адказваючы на пастаўленае пытанне, яны не ведалі самых элементарных рэчаў. Напрыклад, Пракудовіч нічога не магла сказаць пра сталыпінскую рэформу, у чым сутнасць карпілаўшчыны, калі адбылася большэвізацыя Советаў. Самуйлёнак не адказала на пытанне аб двух культурах у буржуазнай нацыі.

С. САВАЧКІНА.

ЭКЗАМЕНЫ НА ФАКУЛЬТЭТАХ ПРАЦЯГВАЮЦЦА

* * *

ЗАМЕТКІ ЭКЗАМЕНАТАРАЎ

ДЗВЕ ГРУПЫ АДНАГО КУРСА—ДВА ВЫНІКІ

Уражанні аб заліку на II курсе аддзялення рускай мовы і літаратуры прымушаюць аб многім задумацца. Дзве групы—два вынікі. Вось адказваюць студэнткі другой групы: В. Фадзеева, Р. Пісарэнка, Л. Сінякова. Збіўчывы пераказ падручніка, а не першакрыніц, бедная, няясная мова, няўменне ацаніць ці прааналізаваць тую або іншую сітуацыю класічных твораў. Гэтыя людзі не палюбілі сваю спецыяльнасць, не заваёўваюць яе працай.

Але вось адказваюць студэнты першай групы. Пры тых-жа аб'ектыўных умовах: пры лекцыях у адным патоку, пры жыцці у адных і тых-жа умовах, але відавочна, пры іншых адносінах да вучобы многія студэнты першай групы адказвалі вельмі змястоўна і жыва.

Адказвае студэнтка В. Караняка. Яна аналізуе першую частку «Фауста» Гёте. Добрае веданне тэксту, удумлівыя адносіны да тых месц філасофскай драмы, якія глыбока раскрыў яшчэ Чэрнышэўскі, дазваляе ёй лагічна завяршыць свой адказ ленінскімі ацэнкамі «Фауста», выкарыстаўшы зусім новыя публікацыі аб адносінах Леніна да Гётэ. Вельмі змястоўна адказвалі Л. Леуданская аб Лопе дэ Вега і В. Кляеўская аб Мальеры. Яны умела выкарыстоўвалі погляды класікаў рускай сцэны, апераваліся сваімі ўражаннямі з тэатра. Студэнтка Л. Гурэвіч увесь адказ аб паэзіі Бернса пабудавала на жывым цытаванні цудоўных песень, вершаў аб свабодзе, едкіх эпіграм. Лёгка прадставіць сабе гэтых таварышоў праз некалькі год, акружаных вучнямі, з захапленнем слухаючых словы свайго настаўніка—словы філолага з універсітэцкім дыпломам.

Комсамольскім групам II курса разам з замацаванымі да групы выкладчыкамі трэба па-дзелавому абмеркаваць не агульныя, а асабістыя вынікі першых заліку і экзаменаў, у час падтрымаць, а асобных таварышоў і пакараць. Вынікі заліку і экзаменаў вызначаюцца самастойнай працай.

Д. Е. ФАКТАРОВІЧ,
дацэнт.

МАТЭМАТЫКА У БІЁЛАГАЎ

Другі год для студэнтаў біялагічнага факультэта чытаецца курс вышэйшай матэматыкі. Неабходнасць увядзення гэтага курса для біёлагаў выклікана пранікненнем апошніх дасягненняў фізікі і сумежных з ёю навук у біялогію.

Вынікі экзамена па вышэйшай матэматыцы на I курсе наступныя: 9 «выдатна», 23 «добра», 14 «здавальняюча», і 4 «нездавальняюча». Студэнты Б. Бародзіч і Э. Корбут і некаторыя іншыя паказалі няведанне матэматыкі за курс сярэдняй школы. Большасць-жа студэнтаў нядрэнна разбіраецца у матэрыяле.

В. Ф. ЖДАНОВІЧ,
кандыдат матэматычных навук.

Увогуле добра, але...

На першым курсе біёлага-глебавага факультэта экзамен па заалогіі беспасванковых меў асаблівае значэнне, таму што гэты курс акрамя вялікага фактычнага матэрыялу змяшчаў многія асноўныя паняцці і тэрміны заалогіі, разуменне якіх неабходна для авалодання заалогіяй.

Для студэнтаў I курса авалоданне гэтым матэрыялам—нялёгкая задача. Для пасяховага вырашэння яе патрэбен мінімум агульнага развіцця і, зразумела, праца. Таму вынікі экзамена добра выяўляюць ступень падрыхтаванасці і здольнасці студэнтаў.

У гэтым годзе вынікі экзаменаў паказалі, што увогуле студэнты добра падрыхтаваліся да экзамена і многія здалі яго на «выдатна». Асабліва добрае веданне матэрыялу паказалі студэнткі Шушкіна, Цэйтліна, Шкляроў, Печэнь, Кручкова, Рыоіна, Наліваіка, Ісаеня, Нікіціна, Рыкоўскі і іншыя. Разам з тым выявілася студэнты, слаба падрыхтаваныя. Атрыманыя імі дрэнныя адзнакі павінны прымусіць іх сур'ёзна працаваць над кнігай.

Г. Г. ВІНБЕРГ,
прафесар.

Літаратуру здаюць журналісты

Экзамен па курсу беларускай савецкай літаратуры для студэнтаў II курса аддзялення журналістыкі быў у поўным сэнсе пробным камнем. Журналіст — літаратурны работнік. Добра, умела напісаны нарыс, фельетон—гэта ўжо літаратурны твор. Важна было-б, каб будучыя журналісты паказалі добрыя веды літаратурнага працэсу, уменне разбірацца ў пытаннях спецыфікі літаратуры.

Экзамен прайшоў роўна. Здавальняючых адказаў 8. Нездавальняючы—адзін. Але, з другога боку, выдатных адзнак курс таксама атрымаў мала—толькі 9, або каля 17 працэнтаў усёй колькасці ацэнак.

Грунтоўныя веды паказалі Савіцкі, Малібошка, Нужкова, Сакалоў, Сцепаненка, Гурэвіч, Бураўкін, Зуёнак, Куцэнка і некаторыя іншыя. Яны прадэманстравалі не толькі добрае веданне тэкстаў, крытычнай літаратуры, а і уменне глыбока разбірацца у складаных пытаннях спецыфікі літаратуры. Іх адказы былі упэўненымі, абгрунтаванымі. Шкада толькі, што такіх адказаў было усё-такі не вельмі многа.

Большасць студэнтаў атрымала добрыя адзнакі. Гэта вельмі радуе. Для будучага журналіста добрае веданне літаратуры абавязкова. Але сярод таварышаў, што атрымалі добрыя адзнакі, ёсць і такія, якія не вельмі глыбока разбіраюцца ў спецыфіцы літаратуры. Такія таварышы добра пераказалі змест твораў, характарызавалі вобразы, але калі гутарка заходзіла аб такіх пытаннях, як сюжэт, кампазіцыя, стыль, у іх знаходзілася вельмі мала слоў для паглыблення адказу.

Агульнае ўражанне ад экзамена добрае. Але разам з гэтым хочацца сказаць: будучыя журналісты маглі-б глыбей ведаць літаратуру.

І. Я. НАЎМЕНКА.

ВЕДЫ ПЕРШ ЗА ЎСЁ

Не пакідаць пры адказе ніводнага няяснага пытання—такога правіла прытрымліваецца па экзаменах выкладчык Т. І. Рагоускі. На яго думку, атрымаць выдатную адзнаку па палітэканоміі—справа нялёгкая, але цалкам даступная для тых, хто добра рыхтуецца на працягу усяго семестра.

Вынікі экзамена на III курсе аддзялення фізікі (другая група) яркі таму доказ: з 25 чалавек, трымаўшых экзамен, амаль трэцяя частка здала на «выдатна», троек няма зусім. Вельмі добрым быў адказ Р. Ляльчук. Па першаму пытанню «Капіталістычная ўласнасць на сродкі вытворчасці — аснова капіталістычных адносін» яна паказала шляхі узнікнення капіталістычнай уласнасці, расказала пра узаемаадносіны класаў і асноўную класавую супярэчнасць пры капіталізме. Добра адказала яна і на астатнія пытанні білета.

Таксама змястоўнымі былі адказы Л. Гладчанка, Н. Інсаравай, Н. Ціхановіч. Усе яны атрымалі выдатныя адзнакі.

Правільна расказвала аб функцыях грошай студэнтка С. Садоўская. Не складала для яе цяжкасці і другое пытанне білета — аб магчымасцях прадухілення воін у сучасную эпоху. Але вось экзаменатар Т. І. Рагоускі задае дадатковае пытанне, просіць растлумачыць паняцце арганічнай будовы капітала. Падрабязны, глыбокі адказ на пастаўленае пытанне С. Садоўская даць не магла. Гэта значыць, што яна не чытала «Капітала» Маркса па гэтаму пытанню.

На працягу усяго экзамена апытанне праходзіла вельмі жыва, проста, у форме, блізкай да гутаркі, так што студэнты мелі магчымасць поўнасцю выявіць свае веды.

Л. ШУМАН.

РЭПАРТАЖ

Заглянем у аўдыторыі

Усюды: у кабінетах, чытальных залах, лабараторыях з падручнікамі і канспектамі можна убачыць усхваляваных студэнтаў. Ва універсітэце працягваюцца экзамены...

Заглянем у 61 аудыторыю хімкорпуса. Тут студэнты III курса здаюць экзамен па крысталахіміі. Па таму, як упэўнена адказвае Клара Забенькова, не цяжка здагадацца, што пройдзены матэрыял яна засвоіла добра. «Выдатна» можна паставіць, але выкладчык яшчэ раз жадае упэўніцца у правільнасці сваёй адзнакі.

— Параўнайце структуру алмаза і графіта, — гаворыць Н. Г. Рафальскі.

Клара узяла патрэбныя структуры і упэўнена адказала на пастаўленае пытанне. А потым не паспела Клара зачыніць за сабой дзверы, як яе акружыў адкурснікі.



— Ну як, — Юле Гарнастаевай не церпіцца даведацца аб выніках экзамена сяброўкі.

Клара расчыніла залікову кніжку — «выдатна»!

Экзамен працягваецца... Ліда Міхалевіч, узброіўшыся структурамі некалькіх металаў, рыхтуецца адказаць (фота 1). Структур мноства. Але трэба сканцэнтравацца. Бачыце, на гэтым здымку (фота 3) Ларыса Маставая. Ёй прыйшла добрая ідэя — яна зрабіла ўпэўнены жэст, ухмыльнулася...

(Працяг на 2 стар.)

Студэнты II курса хімічнага факультэта здавалі першы экзамен — замежную мову.

Вось выходзяць першыя здаўшыя экзамен. Можна і не пытаць, што яны атрымалі. Гэта добра відаць па іх радасных тварах. Асабліва шанцуе «французам».

ПЕРШЫ ПОСПЕХ

— Хоць вас і мала, затое вы у нас перадавікі,— гавораць іх аднакурснікі.—Такі добры вынік—восем пяцёрак падрад і толькі адна чацвёрка!

Без троек здалі яшчэ дзве групы: нямецкай мовы (выкладчык Р. І. Варатніцкая) і англійскай мовы (выкладчык М. Л. Шапіра). У астатніх трох групах 6 троек. Зразумела, і выкладчыкі і студэнты хацелі-б, каб і гэтых троек не было, але усё-ж вынікі нядрэнныя.

Н. ЛЕЎДАНСКАЯ.

НАСУСТРАЧ 40-й ГАДАВІНЕ КАСТРЫЧНІКА

НАМЕЧАНЫЯ МЕРАПРЫЕМСТВЫ ПАВІННЫ БЫЦЬ АЖЫЦЦЁЎЛЕНЫ

(З агульнаўніверсітэцкага партыйнага сходу)

Адбыуся чарговы агульнаўніверсітэцкі партыйны сход. Асноўным пунктам павесткі дня гэтага сходу было пытанне аб ходзе падрыхтоукі да святкавання 40-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі.

Заслухаушы і абмеркаваушы даклад рэктара А. Н. Сеучанка, комуністы з задавальненнем адзначылі, што калектыу універсітэта з вялікім патрыятычным уздымам рыхтуецца да свята, мабілізуючы свае намаганні на паспяховае правядзенне у жыццё задач, пастауленых перад совецкай вышэйшай школай XX з'ездам КПСС.

Пастанова ЦК КПСС «Аб падрыхтоуцы да святкавання 40-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі» шырока і усебакова абмеркавана на рэктараце, у партыйным камітэце, на вучоных советах універсітэта, на паседжаннях кафедр, а таксама у грамадскіх арганізацыях, у выніку чаго выпрацаван канкрэтны план мерапрыемстваў, накіраваных на паляпшэнне вучэбнай, навукова-даследчай і культурна-масавай работы і на дастойную сустрэчу Вялікага Кастрычніка.

План прадугледжвае:

Падрыхтаваць і правесці навуковую сесію і студэнцкую канферэнцыю, прысвечаныя знамянальнай даце.

Падабраць і выдзеліць шырокае кола навуковых работнікаў, аспірантаў і найбольш падрыхтаваных студэнтаў для выступлення у друку і сярод насельніцтва з тэарэтычнымі і прапагандысцкімі артыкуламі, з лекцыямі і дакладамі аб Кастрычніцкай рэволюцыі і яе сусветна-гістарычным значэнні.

Выдаць рад навуковых зборнікаў і манаграфій, звязаных з 40-годдзем Совецкай улады у СССР.

Стварыць ва універсітэце выстауку, прысвечаную 40-й гадавіне Кастрычніка.

Арганізаваць на кожным факультэце сустрэчы з удзельнікамі Кастрычніцкай рэволюцыі, экскурсіі па музеях і памятных месцах Мінска і Беларусі.

На факультэтах правесці студэнцкія канферэнцыі чытачоў па творах, адлюстроуваючых поспехі совецкага народа за 40 год.

У мясцовым друку і па радыё рэгулярна даваць матэрыялы і падборкі, прысвечаныя Кастрычніку, а таксама адлюстроўваць ход падрыхтоукі да свята па універсітэту.

Ажыццявіць юбілейныя выступленні драматычнага і музычнага калектываў, ансамбля і хора з паказам лепшых нумароу мастацкай самадзейнасці як сярод студэнцтва, так і сярод працаунікоу падшэфнага раёна, а таксама фестываль мастацкіх кінофільмаў.

Правесці міжфакультэцкія спартыуныя спаборніцтвы па розных відах спорту.

У перыяд з 25 Кастрычніка па 5 лістапада правесці агульнаўніверсітэцкае і па факультэтах урачыстыя паседжанні з дакладам «40 год Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі».

Выступіушыя таварышы Фрыдман, Абэцэдарскі, Лушчыцкі, Старавойтау і іншыя, у дапауненне к пералічаным мерапрыемствам, унеслі рад каштоуных прапаноў.

Партыйны сход адобрыу у цэлым прапанаваны план, але адзначыу, што рэктарат і партыйны камітэт марудзяць з ажыццяуленнем яго, у выніку чаго тэрміны выканання многіх мерапрыемстваў не вытрымліваюцца, а некаторыя з іх пастаулены пад пагрозу зрыву. Не усе кафедры звярнулі сур'ёзную увагу на якасць навуковых прац, якія рыхтуюцца да выдання. З 13 артыкулаў, якія плануюцца да апублікавання у зборніку, да друку падрыхтаваны толькі 6, астатнія усе яшчэ знаходзяцца у аутарау.

Парткому прапанавана прыняць аператыуныя меры з тым, каб планавыя заданні кафедрамі і асобнымі адказнымі асобамі былі выкананы неадкладна і якасна.

Партыйны сход заклікаў комуністау актывізаваць падрыхтоуку да святкавання 40-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі пад знакам мабілізацыі творчай актыунасці супрацоўнікаў універсітэта на паспяховае ператварэнне у жыццё гістарычных рашэнняў XX з'езда КПСС і на сучасным этапе—задач, звязаных з заканчэннем 1956—57 навучальнага года. Падрыхтоука да правядзення 40-годдзя Кастрычніка павінна ахапіць увесь калектыу універсітэта, усе бакі яго дзейнасці. Паказ сусветна-гістарычнага значэння Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі і вялікіх перамог, атрыманых совецкім народам пад кіраўніцтвам КПСС на шляху да комунізма, павінен легчы у цэнтр усей вучэбнай, навукова-даследчай, палітыка-выхаваучай і культурна-масавай работы. Ён павінен атрымаць глыбокае і яркае асвятленне у лекцыях, на семінарскіх занятках, у сетцы партыйнай асветы, на масавых сходах і у групавых гутарках — усюды, дзе жывуць і працуюць нашы людзі.

ПЯЦІДЗЕСЯЦІГОДДЗЕ

11 чэрвеня 1957 года споўнілася 50 год з дня нараджэння кандыдата філалагічных навук, дацэнта Іосіфа Васільевіча Зазекі.

З 13 год пачалося працоунае жыццё І. В. Зазекі — падзённага рабочага, батрака. 15 гадовым юнаком І. Зазека уступае у комсамол і адразу-ж актыўна уключаецца у грамадскае жыццё. У 1930 годзе ён заканчвае курсы па падрыхтоуцы рабочых у тэхнікумы і ВНУ.

1931 год стаў для І. В. Зазекі другім днём нараджэння—у гэты год ён уступіў у рады Комуністычнай партыі.

Усюды, дзе працаваў І. В. Зазека, ён зарэкамендаваў сябе як чулы таварыш і прынцыповы комуніст.

Працуючы на розных пасадах, Іосіф Васільевіч друкуе ў рэспубліканскіх газетах і часопісах свае творы. У 1932 годзе выходзіць яго зборнік расказаў «Рукою ворага». У ім аутар раскрыў тэму калектывізацыі.

У 1936 годзе І. В. Зазека заканчвае Мінскі педагагічны інстытут, а у 1940 г. — аспірантуру.

... Вялікая Айчынная вайна. І. В. Зазека арганізоувае баявую групу, якая у тылу ворага вяла барацьбу з гітлераўцамі. Ён назначаецца памочнікам начальніка асобага аддзела партызанскай брыгады імя Чапаева Беластоцкага злучэння, рэдагуе партызанскую газету.

Пасля вайны Іосіф Васільевіч зноў працягвае сваю навуковую і педагагічную дзейнасць. Ён абараняе кандыдацкую дысертацыю на тэму «Творчасць беларускіх партызан у гады Вялікай Айчыннай вайны». Яна поунасцю надрукавана асобнымі главамі у часопісе «Полымя».

Пяру тав. Зазекі належыць рад літаратурных прац. Зараз юбіляр падрыхтаваў да 40-годдзя Кастрычніка вялікі зборнік «Паэзія беларускіх партызан», які з'явіцца літаратурным помнікам народным мсціўцам.

Зараз І. В. Зазека працягвае сваю навуковую дзейнасць. Ён чытае курс рускай літаратуры на філалагічным факультэце.

Пажадаем-жа нашаму юбіляру доугіх год жыцця і вялікіх творчых поспехаў.

В. С. КАРАБАН.

40 год НАЗАД
Червеньская дэманстрацыя ў Мінску

16 чэрвеня 1917 года адбыуся шматлюдны сход Мінскага Совета. Выступіушыя на сходзе большэвікі заклікалі рабочых і салдат горада выйсці на дэманстрацыю 18 чэрвеня пад лозунгамі спынення братазабойчай вайны, перадачы зямлі сялянству, арганізацыі і згуртавання мас вакол большэвіцкай партыі.

У спецыяльным звароце па поваду прадстаячай дэманстрацыі гаварылася: «Дадзім-жа дастойны адпор ворагам рэволюцыі. Прадэманструем адзінства усёй рэволюцыйнай дэмакратыі. Няхай усе рабочыя выходзяць з сваіх заводаў і майстэрань. Няхай салдаты стройнымі радамі ідуць поунасцю усёй сваёй часцю. Няхай усе аб'еднаныя рабочыя і служачыя ідуць у радах сваіх профсаюзаў. Усе са сваімі сцягамі! Рыхтуйцеся усе да дэманстрацыі!»

Згодніцкія партыі у Мінску спадзяваліся поунасцю авалодаць дэманстрацыяй і накіраваць яе у русло давер'я Часоваму ураду. Але калі стала ясна, што дэманстрацыю не давядзецца правесці пад «ура-патрыятычнымі» лозунгамі, мясцовая арганізацыя партыі кадэтаў у сувязі з пачаушымся наступленнем на Пауднёва-Заходнім фронце павяла правакацыйную кампанію супраць большэвікоў, абвінавачваючы іх у падрыхтоуцы узброенага паустання у Мінску.

У дзень дэманстрацыі, 18 чэрвеня, кадэты расклеілі па усяму гораду заклікі, у якіх звалі насельніцтва не прымаць удзел у дэманстрацыі, арганізаванай большэвікамі разам з Советам. Але зварот кадэтаў не аказаў уплыву на рабочых і салдат. Масы ішлі за большэвікамі.

У Мінску адбылося 4 мітынгі: на Троіцкай гары, Прывакзальнай плошчы, Ніжне-Ляхавым рынку і Юбілейнай плошчы. Пасля мітынгаў на Плошчы Свабоды адбылася грандыёзная маніфестацыя. На мітынгах большэвікі выступалі з прамовамі, у якіх выкрывалі згодніцкую палітыку меншавікоў і эсэраў, заклікалі рабочых і салдат давесці рэволюцыю да поунай перамогі.

Чэрвеньская дэманстрацыя як у Петраградзе, так і у Мінску сведчыла аб росце давер'я да большэвікоў з боку рабочых і сялян. 24 чэрвеня Мінскі Совет паведаміў аб выніках дэманстрацыі. Яна паказала поунае адзінства сваіх сіл і згуртаванасць у барацьбе за дэмакратычны мір і далейшае развіццё рэволюцыі.

НА КАФЕДРЫ ГІСТОРЫІ КПСС

На апошнім пасяджэнні кафедры гісторыі КПСС былі абмеркаваны вынікі дзяржауных экзаменаў па гісторыі КПСС. Пастаноука гэтага пытання на абмеркаванне кафедры практыкуецца упершыню.

Выступаушыя экзаменатары адзінадушна адзначылі, што падауляючая большасць выпускнікоў паказала на дзяржауных экзаменах трывалыя веды па гісторыі КПСС, уменне прымяняць асноўныя палажэнні марксісцка-ленінскай тэорыі да аналізу сучаснага унутранага і міжнароднага жыцця.

Разам з тым, членамі кафедры быу выказан рад крытычных зауваг. Кандыдат гістарычных навук Н. Е. Гракау прывёу рад фактаў аб тым, што некаторыя студэнты-выпускнікі геаграфічнага факультэта не маглі арыентавацца у элементарных пытаннях нацыянальна-вызваленчага руху у сучасны момант.

Дацэнт В. М. Сікорскі адзначыу, што на дзяржауных экзаменах слабыя веды праяуляюць, як правіла, тыя студэнты, якіх «выцягвалі» на семестравых экзаменах.

ЭКЗАМЕНЫ НА ФАКУЛЬТЭТАХ ПРАЦЯГВАЮЦЦА

Заглянем у аўдыторыі

...У суседняй аўдыторыі экзамен здаюць па педагогіцы студэнты III курса геолага-геаграфічнага факультэта. Адказвае Віктар Маркевіч. Выкладчык ставіць яму «добра». Ля адной з аудыторый стаупіліся географы-другакурснікі. У іх экзамен па асновах індустрыяльнай вытворчасці. Выбягае Ліда Дабравольская:

— «Добра»!—паведамляе яна сяброукам.

— Ні пуха, ні пяра,— праважаюць на экзамен Антона Ткачова...

Пакуль Антон Ткачоў Віктар Кісялёў і Анн Косьміна адказваюць, і аднакурснікі Ларыса П... ипенка і Леу Бурца ...шчэ раз перагортваюц... анспекты (фота 2) Здаецца, што нешта яшчэ не прачытана.

На фізіка-матэматычным факультэце экзамены пачаліся крыху пазней, чым на іншых факультэтах. Мы зайшлі ў лабараторыю кафедры электрафізікі. Аня Чубрык, размясціушыся ў далёкім кутку пакоя, «штудзіравала» матэрыял аб тонкай структуры атама вадарода (фота 3).

— Калі ласка, не перашкаджайце, папрасіла яна, калі мы хацелі сфатаграфаваць яе. — Хутка здаваць квантавую механіку, тут не да жартаў...

Аднакурсніцы Ані Чубрык, студэнткі IV курса аддзялення фізікі Эм... ількевіч і Таіса Якубёк старанна вывучалі намальны эфект Зеемана.

На філалагічным факультэце ўжо некаторыя курсы здалі экзамены дны добра, другія — орш. Асабліва добра аказаў сябе III курс аддзялення беларускай мовы і літаратуры на экзамене па гісторыі беларускай мовы. Троек тут няма. На II курсе гэтага-ж аддзялення таксама паспяхова ідуць экзамены.

Аня Шчэрбачэня і Ніла Семяновіч паспяхова здалі экзамены па гісторыі беларускай літаратуры, але як не паглядзець у шчылінку, дзе адказваюць сяброукі? (фота 1)

А Паша Старавойтава толькі што здала экзамен і цяпер сядзіць за сталом дзяжурнага інтэрната. Твар дзяучыны свеціцца радасцю — яна задаволена пачаткам летняй экзаменацыйнай сесіі (фота 4).

А гэта пяцікурснікі аддзялення журналістыкі Уладзімір Хмяльніцкі, Святлана Панова, Наташа Крэмень і Нэла Кар'янава. Яны толькі што здалі дзяржауны экзамен па гісторыі КПСС, а зараз чакаюць вынікаў.

— Пранесла, — гаворыць С. Панова, — закінуушы руку назад (фота 5).

КАЛІ ЛЮБІШ ПРАЦУ І РАМАНТЫКУ...

З ФАКУЛЬТЭЦКІХ МІТЫНГАЎ

ПАМНОЖЫМ БАГАЦЦІ КРАІНЫ!

14-га чэрвеня газеты надрукавалі заклік ЦК ВЛКСМ да моладзі і камсамольцаў дапамагчы цалінікам сабраць багаты ураджай. У той-жа дзень студэнты філалагічнага факультэта сабраліся на мітынг, прысвечаны гэтай падзеі.

Адзін за другім на трыбуну падымаюцца студэнты. Яны знаходзяць цёплыя, кранаючыя сэрца словы, расказваючы пра гераічную працу студэнтаў-цалінніка і заклікаючы зноў паехаць на уборку ўраджаю.

— 9000 тон зерня было сабрана і ссыпана ў зернесховішчы двума паляводчымі брыгадамі студэнтаў-філолагаў у саўгасе імя Фрунзе.

Ім былі прысуджаны 1-ая і 2-ая прэміі зернесоўгаса, — гаворыць сакратар камсамольскай арганізацыі філфака Я. Клімаў. Ён выражае надзею, што у гэтым годзе студэнты-філолагі не толькі не згубяць сваёй славы, але і павялічаць яе новымі працоўнымі подзвігамі. У заключэнне Клімаў называе шэраг прозвішчаў студэнтаў, якія яшчэ да мітынга вырашылі ехаць на цаліну.

— Некаторыя думаюць, што на цаліне іх чакае толькі цяжкая праца. Яны не ведаюць, што паездка на цаліну цікавей усякага турысцкага паходу. У барацьбу за хлеб, таварышы!—заклікае сваіх сяброў Нікалай Рожын.

Канстанцін Свёкла заявіў:

— Уся краіна рыхтуе падарункі да 40-й гадавіны Вялікага Кастрычніка. Самаадданая праца на уборцы цалінніга ураджаю будзе лепшым нашым падарункам Радзіме, народу.

Аб цудоуных уражаннях ад паездкі на цаліну расказвае А. Рыбак.

— Мне зноу хочацца паехаць, каб зноу адчуць тую дружбу, якая можа нарадзіцца толькі у працоуных буднях.

Ён з любоую успамінае студэнтаў іншых ВНУ, якія таксама дапамагалі ва уборцы цалінніга ураджаю і з якімі так дружылі нашы студэнты. Колькі цёплых успамінаў, колькі цёплых пісем ад новых сяброу! Праудзіва пяецца у песні: «И друзей целинных не легко забыть».

Сакратар камітэта камсамола універсітэта Я. Бабосау выразіу упэуненасць, што студэнты-філолагі і у гэтым годзе унясуць вялікі уклад у казахстанскі ураджай, што не 70, як у мінулым годзе, а 150—200 студэнтаў пададуць заявы з просьбай паслаць іх на цаліну.

Заключнае слова прадстауляецца Д. Е. Фактаровічу. Ён гаворыць аб тым, што іменна у такіх справах расце жыццёвы і працоуны вопыт маладога чалавека. Усё гэта не запісваецца у дыпломе, аб гэтым не выдаюцца спраукі, але затое у будучым ніколі не зблытаюць чалавека, які сам папрацаваў, з чалавекам, які умее толькі прыгожа гаварыць аб працы.

Адзінадушна прымаецца рэзалюцыя. Мітынг аб'яуляецца закрытым. Але доуга яшчэ не разыходзяцца студэнты, доуга яшчэ у пасобных групках абмяркоуваецца мітынг і планы будучай паездкі.

С. АНЦІПЕНКА,
Н. ЛЕУДАНСКАЯ.

* * *

17 чэрвеня адбыуся мітынг выкладчыкаў і студэнтаў юрыдычнага факультэта, прысвечаны абмеркаванню зварота ЦК ВЛКСМ аб уборцы ураджаю на цалінных землях.

Выступіушыя студэнты юрфака Доубыш, Бясчаснау, Сарока і гістарычнага факультэта—Якімау і Сяргееу, якія у ліку першых выказалі жаданне паехаць на цаліну, адобрылі зварот ЦК ВЛКСМ, заклікалі комсамольцаў прыняць удзел ва уборцы багатага ураджаю і сваёй працай множыць багацці пашай Радзімы.

Студэнт Сяргееу, які ездзіу на цаліну у мінулым годзе, звярнуу увагу прысутных на неабходнасць стварэння ужо зараз комсамольскіх рабочых брыгад, для таго, каб праявіць максімальную арганізаванасць як у час паездкі, так і на соугасных і калгасных палях у час уборкі ураджаю.

— Мы не дзеля грошай едзем, але ці дрэнна апрануць добры касцюм, набыты за зароблены грошы? Гэта лепш, чым надзець вузенькія штонікі і модны да кален піджак, пашыты на грошы бацькоу.

Пасля мітынгу удзельнікі яго прыступілі да стварэння комсамольскіх рабочых брыгад, якія паедуць на уборку.

Многія комуністы і комсамольцы горача адгукнуліся на зварот ЦК ВЛКСМ. Сярод іх студэнты Фралоу, Глазкоу, Камоза, Баранава, Сіуцоу і іншыя. На першым курсе юрыдычнага факультэта адразу-ж пасля мітынгу 20 комсамольцаў падалі заявы з просьбай накіраваць іх на цаліну.

І. С. ЦІШКЕВІЧ.

ПРЫВІТАННЕ, ЦАЛІНА!

Цаліна!

— Можа, ораткі, ізноў з'ездзім? А?

Кожны з іх, жыхароў пакою № 19 трэцяга інтэрната, дауно ужо падумваў аб гэтым.

— А чаму-бы і не?

Рашэнне прынята цвёрда і беспаваротна. Зборы будуць нядоугімі: цяпер ужо хлопцы ведаюць, што браць з сабой.

— У мінулым годзе, памятаю, — расказвае адзін з іх, студэнт 2 курса гістфака Г. Галенчанка,—купую я пяць банак сгушчанага малака, кансервіну „рыбную, узяу кацялок—каб можна было у «дзікіх месцах» полудзень зварыць—горда агледзеуся вакол і сеу у цягнік.

Як мы прадстаўлялі сабе цаліну? А вось як: яна дзесьці на поудні, там ёсць казахі, юрты і вярблюды, а травы зусім няма, хоць шаром пакаці — адны дзюны ды барханы пясчаныя.

Як бачыце, прагнозы нашы былі як у бюро пагоды, — усміхаецца Жора, — і усё-ж паехалі. І доўг комсамольскі загадваў, і вельмі ужо хацелася самім, сваімі рукамі да жыцця дакрануцца.

Казахаў, юрты і вярблюдау мы на самай справе знайшлі. Аказалася, і трава тут расце! Глеба гліністая, патрэскаушаяся, а па ёй—жорсткія кусцікі травы.

Жылі у палатках, дыхалі стэпам.

Работы хапала на усіх. Дождж ідзе—збірай зерне у бурты, бо згарыць. Праяснілася неба — разграбай бурты, варушы зярно, каб прасыхала.

Цяжкавата прыходзілася. Па начах холад прабіраў. Днём—жара. Але хлопцы у нас падабраліся моцныя, ды і дзяучаты нічога — справіліся.

Ускаквае, памятаю, Ждановіч, хапае сваю лапату (яна у яго самая вялікая была і жалезам абіта), улазіць у кузау нагружанай зернем машыны і як «дасць копаці»—толькі рукі у яго, быццам спіцы у веласіпедзе, мільгаюць, ды з зерня Эльбрус залаты расце. Машына праз мінуту ўжо пустая стаіць.

Што і гаварыць, не тое яшчэ бывала...

А банкі з малаком не спатрэбіліся—харчаваліся мы добра...

І вось мы зноў рыхтуемся у дарогу. Асабліва не хвалюемся: едзем-жа мы да старога, добрага сябра. Паглядзім яму у абветраны стэпавымі ветрамі твар і скажам:

— Прывітанне, Цаліна!

І. ВЫСОКІ.

НА ПРАЦУ, СЯБРЫ!

Як толькі я прачытаў заклік ЦК ВЛКСМ, мне прыпомніуся мінулагодні ад'езд на цаліну. Колькі было жахау, няупэуненасці... Цалина уяулялася нейкім другім светам, дзе, акрамя сонца, нічога няма: ні вады, ні травы. Некаторыя нават для выпрабавання па цэламу дню не шлі. Мы бралі з сабой па тры катушкі нітак, па дзесятку іголак, па некалькі кавалкау мыла: тамжа гэтага нічога не будзе.

Прыехалі мы у Қазахстан і упэуніліся у адваротным: і вада там ёсць (у брыгады прывозілі з цэнтральнай сядзібы), і трава, і прамысловыя і гаспадарчыя тавары, нават свежыя алмаацінскія яблыкі і карамель «Кізыл» прывозіць ауталаука. А галоунае, каго там мы сустрэлі,—гэта цудоуных, задушэуных і шчырых людзей.

Дарагія дзяучаты, хлопцау лепшых і весяленшых, чым цаліннікі, нідзе болей не знойдзеце!

Хто не адчуваў, як уночы пахне палын у стэпе, хто не бачыу зорнага-зорнага казахстанскага неба, не спявау пад ім любімых песень, хто пасля старанной працы пад гармонік не танцаваў на цалінным паркеце—зямлі, што аж пыл курэу,—той многа патраціу. Юнакі і дзяучаты, пакуль не позна, нагняйце упушчанае!

А якое гэта шчасце праехаць прасторамі Расіі! А якую адчуваеш радасць, калі перад табою прыгажуня-Волга!

Усяго не перадасі, лепш за усё—паехаць і сваімі вачыма усё убачыць, ва усім пераканацца самому.

Хто любіць працу з аганьком, хто любіць рамантыку,—на цаліну, сябры!

Рыгор БАРАДУЛІН,
студэнт 3-га курса філфака.

Едзем!

Хто у маленстве з нас не займздросціу старэйшым, якім давялося быць удзельнікамі гераічных падзей грамадзянскай вайны, якія мелі магчымасць залажыць першы камень у падмуркі сёння квітнеючага Комсамольска-на-Амуры, якія мужна змагаліся на франтах Вялікай Айчыннай вайны ці неслі баявую партызанскую службу у тылу ворага.

Але многа адказных, пачэсных спраў засталося і нам, маладому пакаленню.

Летась з сябрамі па курсу я дапамагаў убіраць ураджай у зернесоугасе імя Фрунзе Кустанайскай вобласці. Добрыя уражанні я прывёз з сабой з цаліны.

З пачуццём задавальнення успрыняу я новы зварот ЦК ВЛКСМ. Я заклікаю студэнтаў універсітэта дапамагчы працаунікам цалінных земель убраць ураджай! Едзем на цаліну!

БАГДАНОВІЧ,
студэнт 2-га курса філалагічнага факультэта.

На здымку: (справа налева): Фелікс Пазнякевіч, Аляксандр Рыбак, Канстанцін Свёкла, Алег Сініцкі і Уладзімір Будай—студэнты філалагічнага факультэта, якія першымі выказалі жаданне паехаць на уборку цалінніга ураджаю.

Вось яно сапраўднае, юнацтва комсамольскае

У мінулым годзе па заклiку ЦК ВЛКСМ мы паехалі на цалінныя землі Қазахстана, каб дапамагчы цалінікам ва уборцы ураджаю. Некаторыя цікавяцца, якія імкненні кіравалі намі: патрыятычныя ці рамантычныя. Цяжка адказаць. Бадай, і тыя і другія. У нас увесь пакой «цалінны», як мы называем. Два праведзеныя там месяцы назаусёды застануцца у памяці.

Зараз кожны нязначны факт здаецца цэлай падзеяй. І гэта не дзіуна, бо кожны дзень прыносіу нешта новае, незвычайнае.

Қалі мы ехалі на цаліну, нам хацелася убачыць як мага больш. Перад вачыма узнікалі усё новыя і новыя карціны, хацелася глядзець, не адрываючыся. Усе узбуджаныя, радасныя, усхваляваныя.

Многіх цікавіць, як мы там працавалі. Усякае было. Часамі прыходзілі у палатку такія стомленыя, што не маглі паварушыць ні рукой, ні нагой, але адчувалі маральнае задавальненне: мы таксама рабілі нешта карыснае, патрэбнае. Мы ніколі не сумавалі. У нас быу добры калектыу, і усюды разам з намі была песня. Вось яно, сапраўднае юнацтва комсамольскае.

Усім таварышам, якія у гэтым годзе збіраюцца ехаць на цаліну, мы гаворым: «Не памылiцеся, не паікадуеце».

В. КІРЫЛАВА, А. КАРСАК,
Н. КУДРЭЙКА,
Р. ЛЯГУЦЕНКА,
Л. ШАЛАЙ,
студэнткі IV курса філфака.

ДАВЕР'Е АПРАЎДАЕМ!

Азнаёміушыся з заклікам ЦК ВЛКСМ, мы, студэнты 3-га курса беларускага аддзялення, цвёрда рашылі паехаць на цаліну, каб дапамагчы ва уборцы багатага ураджаю. Мы ведаем, што будзе нялёгка, але нас не палохаюць цяжкасці.

Мы ганарымся тым, што зможам укласці частку сваёй працы у гэтую высокародную справу. Пастараемся апраудаць званне комсамольцау.

ПАЗНЯКЕВІЧ, СВЁКЛА,
БРЫЛЬ, ВІНЦЭВІЧ,
ЗАГОСКІНА, КЛІМЕНКА,
МАРТЫНОЎСКАЯ

ДАРАГІЯ ПІСЬМЫ

У мінулым годзе студэнты нашага універсітэта працавалі на уборцы цалінніга ураджаю у соўгасе імя Фрунзе. Завязалася шмат знаёмстваў з цалінніками. У сяброускай перапісцы з нашымі студэнтамі яны з удзячнасцю успамінаюць аб тых днях, калі разам выконвалі вялікае і пачэснае заданне Радзімы. Ніжэй мы змяшчаем урыўкі з пісем, якія атрымала з цаліны студэнтка 4-га курса фізмата Галіна Чырына.

«...За поспехі, дасягнутыя у 1956 годзе, наш соугас зацверджан удзельнікам УСГВ у Маскве. У гэтым вялікая заслуга належыць і вам, студэнтам, дапамагаушым нам на уборцы ураджаю...

...Скончылі зяблёва і ворыва. Усе жывём на сядзібе. Рыхтуем да свята канцэрт мастацкай самадзейнасці. Пастараемся на раённым аглядзе заняць першае месца. Наогул, час праходзіць вельмі весела. У нас будуецца клуб, так што будзем хутка танцаваць у новым клубе. Прауда, без вас стала неяк сумнавата. Прыязджайце да нас зноу, я будзе весела, ды і ураджай павінен быць лепшы...

...Работы хапае, толькі працуй. Рыхтуемся да вясенніх палявых работ. З усіх канцоу Савецкага Саюза да нас прыходзяць пісьмы. Усе цікавяцца нашай работай, і многія жадаюць паехаць на работу у наш соугас...»

Убраць ураджай здолеем!

У мінулым годзе студэнты з вялікім натхненнем адгукнуліся на зварот ЦК ВЛКСМ. Радасна было усведамляць, што і нам прадстаўляецца магчымасць прыняць удзел у вялікай і важнай дзяржаўнай справе—барацьбе за павелічэнне збору зерня у краіне. На нашым курсе была створана ударная комсамольская брыгада.

Ажыуленне панавала ў вагонах на працягу усяго шляху цягніка у Кустанайскую вобласць. Жарты, песні і вясёлы смех, абмеркаванне прадстаячай работы чуліся ва усіх вагонах. А потым нас усіх захапіла прыгожая карціна бясконцых прастораў спеючай пшаніцы.

Пачуццё радасці і юнацкага запалу не пакідала нас увесь перыяд уборкі, калі тысячы тон ядранага зерня паплылі з-пад камбайнаў на такі соугаса.

На уборцы ніхто не лічыуся з часам. Часта прыходзілася працаваць ад усходу да заходу сонца. Не згасалі тысячы электрычных агнёу, не змаукалі маторы і галасы людзей усю ноч. Қазахстанскія стэпы, дарэчы, немагчыма уявіць без несупыннага рокату маторау і вялікай колькасці электрычных агнёу. Тут асабліва адчуваецца панаванне працы чалавека на зямлі. Гэтае уражанне узбуджае пачуццё глыбокага задавальнення, а, можа быць, гэта і ёсць пачуццё той гордасці, аб якой сказаў Маякоускі:

«Радуюсь я,
это мой труд
вливается в труд
моей республики».

Відаць, у гэтым і заключаецца рамантыка працы, і ніхто з нас ніколі не адчуваў стомленасці; пасля напружанай працы звычайна панаваў вясёлы настрой.

Безумоуна, было дастаткова часу і для адпачынку, і для забаў. У адну з нядзель на спартыунай пляцоуцы соугаса і на сонечным беразе Табола быу праведзен фестываль з удзелам нашых студэнтаў і рабочых соугаса.

Да ад'езду з соугаса мы убралі увесь ураджай. З пачуццём глыбокай удзячнасці за дапамогу праводзілі нас рабочыя соугаса. Многія нашы студэнты былі прэміраваны дырэкцыяй соугаса і ўзнагароджаны граматамі ЦК ВЛКСМ і значкамі «За асваенне новых зямель».

Қалектыуная праца яшчэ больш згуртавала нас. Назад мы прыехалі бадзёрымі, узмужнелымі. Слаўна папрацавалі у мінулым годзе комсамольцы Гроднікау А., Песенка Н., Качкоу В., Бародзіна і іншыя.

У гэтым годзе яны зноу выказалі жаданне паехаць у Қазахстан на уборку цалінніга ураджаю. Жадаючых прыняць удзел ва уборцы вельмі многа.

Дзякуй нашым слаўным пакарыцелям цаліны за вырашчаны багаты ураджай. Убраць яго мы заусёды дапаможам!

В. ГНІЛАМЕДАЎ,
студэнт 2-га курса фізмата.

КНІГА АБ „ЗВЯЗДЗЕ“



Гісторыя партыйна-савецкага друку Беларусі яшчэ не напісана, яго дзейнасць пакуль што надзвычай слаба асветлена у нашай літаратуры. Да апошняга часу мы мелі толькі адну надрукаваную манаграфію І. Краўчанкі «Падпольны большэвіцкі друк у Беларусі у гады Вялікай Айчыннай вайны». Акрамя гэтага змешчана некалькі артыкулаў у розных перыядычных выданнях, асвятляючых той ці іншы перыяд друку рэспублікі.

Нядаўна выйшла у свет кніга М. Зярніцкага «Газета «Звязда» у барацьбе за перамогу Кастрычніцкай рэволюцыі у Беларусі». Выходным матэрыялам для гэтай кнігі паслужыла кандыдацкая дысертацыя, якую аутар абараніў у нашым універсітэце.

Выхад у свет гэтай кнігі нельга не вітаць. «Звязда» з'яуляецца старэйшай большэвіцкай газетай Беларусі. Яе паяуленне было выклікана наспеушымі патрэбамі рэволюцыйнага руху у бурныя жнівеньскія дні 1917 года, дні напружанай барацьбы рабочых і сялян за уладу Советаў, за завяаванне мас на бок большэвікоу.

М. С. Зярніцкі паставіу перад сабой задачу паказаць, як газета мабілізоувала і арганізоувала масы працоуных Беларусі і Заходняга фронта на барацьбу за перамогу Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі.

У першым раздзеле кнігі аутар паказвае абстаноуку у Беларусі напярэдадні Лютаускай буржуазна-дэмакратычнай рэволюцыі. У ім таксама, расказваецца, як была сустрэта газета, асобна падкрэсліваецца роля ЦК партыі у яе узнікненні.

Асвятленню дзейнасці газеты у барацьбе за ажыццяуленне рашэнняу VI з'езда партыі прысвечан другі раздзел кнігі. Тут аутар спыняецца на высвятленні ролі газеты у данясенні да шырокіх мас пастаноу VI з'езда РСДРП, нацэліўшага партыю на узброенае паустанне, у звяржэнні улады памешчыкаў і капіталістаў і завяаванні дыктатуры пролетарыята. Вялікую ролю адыграла «Звязда» у перыяд арганізацыі штурму буржуазіі, а таксама у дні Кастрычніка. Выяснению гэтай ролі прысвечан трэці раздзел кнігі.

Пасля звяржэння улады капіталістаў і памешчыкаў газета змагалася за умацаванне Совецкай улады у Беларусі, яна даносіла да мас першыя дэкрэты Совецкай улады, актыуна змагалася за іх ажыццяуленне. У чацвертым раздзеле кнігі і высвятляюцца гэтыя пытанні.

Асобны раздзел кнігі прысвечан масавай рабоце газеты. Тут аутар расказвае аб сувязях газеты з чытачамі, аналізуе салдацкія пісьмы, паказвае, якімі жанрамі карысталася газета, раскрывае яе барацьбу супраць буржуазіі і меншавіцка-эсэраускіх газет.

Кніга М. С. Зярніцкага зможа быць выкарыстана студэнтамі аддзялення журналістыкі у якасці вучэбнага дапаможніка па спецкурсу гісторыі беларускага совецкага друку.

Гэты здымак зроблен у лабараторыі практыкума па фізічнай хіміі. Віталія Пшанічны, студэнт III курса хімічнага факультэта, выкапаў апошняе практычнае заданне—вызначэнне лікау пераноса іонаў. Асістэнт Ф. Капуцкі правераў запісы, вылічэнні, схемы, выкананыя Пшанічным і сказаў: „Добра. Так і экзамен здавай“.

На экзаменах у Віталія справы не горш, чым у лабараторыі.

Фота М. Пільшчыкава.

А ВОЗ—НІ З МЕСЦА

Праз невялікія напоузанавешаныя пыльнымі фіранкамі забруджаныя вокны, ледзь-ледзь прабіваецца святло. Гудзе касавая машынка, у касы чарга — вокам не акінуць, такая-ж чарга у акна выдачы. Доуга чакацаь, пакуль атрымаеш страву, бо стаяць прыходзіцца часам 15-ым, а то і 20-ым чалавекам у чарзе. А часу мала, ідуць экзамены, вучыць трэба.

Там хтось адкрыу кнігу, другі чытае газету, а вось гэтыя двое няветліва адклікаюцца у адрас администрацыі.

— Запісаць бы ім у кнігу скаргау.

— Ды што пісаць, пісалі ужо і у кнігу, і у газету—усёроуна нічога не змяняецца.

Вось гэты студэнт падымаецца па усходах з падвала, яму нават не хапіла месца стаць у чаргу.

І усё гэта не дзе-небудзь там, за трыдзевяць зямель, а у нас, ва універсітэцкай сталовай. Нездавальняюча тут пастаулена грамадскае харчаванне студэнтау.

Дакуль гэта можна мірыцца з тым, што сталовая, пачынаючы працаваць а дзесятай гадзіне, да 11—12 гадзін адпускае усяго толькі палову абазначанага меню? Або, наадварот, з дзесяці гадзін усе блюды ёсць, а к 14 гадзінам большая палова з іх не выдаецца. Так, 16 мая першыя блюды к гэтаму моманту складаліся... з гарохавага супа. Прыдзіце вы абедаць сёння, прыдзіце заутра — блюды аднастайныя. У буфеце вельмі абмежаваны асартымент прадуктау, прытым завозіцца іх у недастатковай колькасці. Амаль зусім не прыгатауляюцца вінегрэты, салаты, радыска і іншыя харчовыя вырабы, якія карыстаюцца павышаным попытам у студэнтау. Сам унутраны выгляд сталовай робіць непрыемнае уражанне. Нідзе тут не убачыш ніводнага палавіка, сцены пачарнелі і, як плюшчом, абвіты водаправоднымі трубамі, са столі звешваюцца дзесяткі ліпучых бумаг для мух. Столь вельмі нізкая і у «ліпучку» часта падаюць валасы таго, хто дасягнуу паутарамятровага росту. Сталовая не абсталявана навейшай кухоннай тэхнікай. Дзедауская пліта, топячыся дрэвамі, неізалявана ад агульнай залы і стварае нязносную гарачыню у невентыліруемым памяшканні сталовай. Сталовыя прыналежнасці дауно патрабуюць замены.

Не праяулена ніякіх клопатау да арганізацыі продажу пончыкау, булачак і іншых штучных тавараў у разнос па вучэбных карпусах. Зусім ненармальным з'яуляецца тое, што сталовая не працуе у нядзелю зараз, у перыяд экзаменацыйнай сесіі. Дарэчы, у нядзелю не працуе і буфет, што у корпусе «А». Экспедытары нядбайна, у брудпай верхняй вопратцы заносяць прадукты з вулицы у сталовую.

У той час, калі у многіх сталовых пераход на самаабслугоуванне дау станоучыя вынікі, то у нашай — наадварот, прапускная здольнасць сталовай нікольки не павялічылася, на водпуск абедау траціцца залішне многа часу. Чаны са стравай знаходзяцца далёка ад вакна выдачы і раздатчыку прыходзіцца, прыняушы ад студэнта чэкі, рабіць за кожным блюдам па 6 і больш метрау. У выніку на абслугоуванне аднаго студэнта траціцца 2—3 мінуты. Выходзіць, каб атрымаць 20-му чалавеку з чаргі страву, патрэбна прачакаць 40—60 мінут.

Безадказна адносіцца загадчык сталовай тав. Багдановіч да таго, што прадукты у сталовую завозяцца нерэгулярна. З 10 гадзін пачынаецца водпуск некаторых блюд, а другія пачынаюць яшчэ толькі у гэты час варыцца. На выдачы страу стаіць адзін чалавек, другі-ж увіхаецца, варыць. Вось перад намі адна з скаргау студэнткі біяфака: «У меню напісана: вінегрэт, боршч, аладкі. У 10 гадзін, аказваецца, вінегрэта і аладак на кухні няма». Загадчык сталовай знайшоу гэтаму «универсальны» довад: «Ввиду сырых дров повара не в состоянии были приготовить своевременно оладьи и винегрет». Нядауна група студэнтау хацела дазнацца у Багдановіча, чаму у 13 гадзін не выдаваўся чай і жараная траска. Загадчык сталовай не мог даць абгрунтаваны адказ.

Многа яшчэ іншых недахопау маецца у рабоце сталовай: нерэгулярна ўвозяцца з сталовай парожнія бутэлькі, бочкі, бідоны з-пад малака і г. д.

Але дзе-ж загадчыку сталовай тав. Багдановічу з усім справіцца— у яго-ж не адна наша сталовая: ён загадчык і сталовай Інстытута народнай гаспадаркі, ды і кіраванне буфетамі у гэтых навуковых установах даручана яму. За усім не збегаешся. Нездарма яго можна рэдка бачыць у нашай сталовай.

Пажадана лепшая якасць прыгатаўляемых страу. Вараная капуста і суп выдаюцца звычайна без усялякіх прыпрау. Пападаючаяся бульба у супах мае такі чорны і непрыглядны выгляд, што міжволі падумаеш, наурад ці расце у Беларусі такая. А сама ежа не выклікае апетыта, а наадварот, псуе яго. Калі былі мучныя блюды у меню, аб гэтым памятае толькі «кніга скаргау».

Наступіла лета, павялічыуся попыт на малочныя прадукты, па зеляніну, гародніну.

Нельга дапусціць, каб з-за абыякавасці і непаваротлівасці загадчыка сталовай тав. Багдановіча ушчамляліся інтарэсы студэнтау універсітэта. Хочацца задаць пытанне грамадскім арганізацыям універсітэта: дакуль можна ліберальнічаць у адносінах загадчыка сталовай М. М. Багдановіча, колькі можна пісаць пастаноу дзеля пастаноу?

І. СТАРАВОЙТАУ.

АБЫ ЗДАЦЬ

Вось тры курсавыя работы студэнтак III курса аддзялення журналістыкі: Н. Даніленкавай, Д. Пераверзевай, Л. Саучанка. Аутары першых двух канчаткова «разносяць» рэдакцыю газеты «Заря» (Ваукавыскі раён), а студэнтка Л. Саучанка узяла на сябе ролю кап'ямятальніка супраць газеты «Голас калгасніка» (Крупскі раён).

Далей усіх пайшла Д. Пераверзева, абвінаваціушы рэдакцыю «Голаса калгасніка» у незацікаулёнасці да выпуску газеты, а раённы камітэт партыі — у адсутнасці кантролю за газетай. Яна галаслоуна сцвярджае, нібыта газета з'яуляецца дрэннай у стылістычных, граматычных адносінах і «выходит также слаба в партийном отношении». Хлусня! Дастаткова толькі прачытаць перададзыя артыкулы, каб упэуніцца, наколькі яны ідэйна вытрыманы.

Л. Саучанка піша: «слово «царызм» употреблено для воспроизведения деревни в прошлом» Спяшыла,—чаго яе вініць? Яна нават прозвішча селькора запісала замест Рабкоу—Рабко і ва усім тэксце замест літары «б» піша «в»: «лювы калгаснік», «выу сабран».

А у заметцы «Як даглядаюць, так і маюць» яна зауважыла «конкретные указания чем кормить корову». З гэтага яна заключае, што заметка «написана в деловом тоне». Далей, Саучанка заяуляе, што у газеце «Голас калгасніка» бытуюць толькі тры жанры: невялікая заметка, перадавы артыкул, інфармацыя, што таму газета адиастайная. А хіба у газеце няма аддзела «Наш вожык», дзе даны сатырычныя замалёукі, яркія малюнкі, якія ажыуляюць усю газету? Але дзе-ж Саучанка убачыць гэты аддзел!? «Наш вожык» знаходзіцца на другіх старонках, а яна разбірала чамусь толькі першыя.

А вось перлы крытычных зауваг Пераверзевай і Даніленкавай з поуным захаваннем іх правапісу: «нет общих рассуждений о директивах партии и правительства», «газета исключительно удачн нашла начало передовой», «пропагандисткая статья», «не стремятся сделать газету отвечающий на требования ЦК партии в отношении к районным газетам», «если в газете и проскальзывали правильные употребления, то в стилистическом использовании грамматических средств языка газета хромает сразу на две ноги».

Студэнты Н. Даніленкава, Д. Пераверзева, Л. Саучанка ганьбяць курс, факультэт. Нельга дапусціць, каб такія Даніленкавы, Пераверзевы і Саучанкі заканчвалі універсітэт, а потым ганьбілі яго сваім дылетанствам.

В. ІСТРОУ.

КАСА ЎЗАЕМАДАПАМОГІ БЕЗДАПАМОЖНА

Колькі клопатау дастауляе збор подпісау для абхаднога лістка! Але многія ўмудраюцца самі яго падпісаць—кантроль за подпісамі невялікі: прыдзеш у бухгалтэрыю, падасі 30—40 такіх лісткоу ад групы, бухгалтар К. І. Песткоускі пералічыць іх неправерыушы — і атрымоўвай стыпендыю. У выніку многія, зусім не ставячы роспісау, другія—сваей рукой іх паставіушы, выходзяць «сухімі з вады». А такіх толькі быушых выпускнікоу па універсітэту 22 чалавека. Кахновіч атрымау у касе узаемадапамогі 500 рублёу і не вярнуу іх, яго жонка Кішчанка, якая працуе у выдавецтве БДУ, таксама не разлічылася з касай узаемадапамогі. Жонка выкладчыка кафедры фізвыхавання тав. Кушнарова Т. Цімашчук і брат сакратара партыйнага бюро фізмата С. Гусак таксама не пагасілі пазыку, узятую у касе узаемадапамогі. І такіх выпадкау, нажаль, многа. Мінулыя выпускнікі не звярнулі 4200 рублёу.

Члены праулення касы рабілі спачатку спробы адшукаць даужнікоу, але потым, пасля раду безвыніковых запросау, склалі рукі і цяжка уздыхнулі:

— Дзе-ж іх знайсці? У крымінальны розыск мо падаць? Дык гэта будзе вельмі дорага...»

Многія выпускнікі не разлічыліся поунасцю з бібліятэкай і фізкафедрай.

Недалёкі той час, калі новы атрад выпускнікоу пойдзе на вытворчасць. Аднак яны да гэтага часу не усе разлічылися з касай узаемадапамогі. Сярод іх: Макарэвіч, Стражэвіч, Мурашка, Адзінцова, Тарасевіч, Бука—усяго 31 чалавек з агульнай сумай запазычанасці 5.083 рублі. Ігнарыруецца прамы абавязак члена касы узаемадапамогі: уплачваць пазыку у шасцімесячны тэрмін. Так, студэнтка Адзінцова узяла 100 рублёу 44 месяцы(!) таму назад і да гэтага часу не разлічылася.

Адбудзецца выпуск — і зноу будзе павезена значная сума студэнцкіх зберажэнняу.

Прауленне касы ліберальнічае у адносінах да сваіх нерадзівых членау.

Але навошта тады абхадныя лісткі, наогул, калі яны прымаюцца оптам, без праверкі? Бухгалтэрыя павінна аднесціся з усёй сур'ёзнасцю да абхадных лісткоу, як да грашовых дакументау, а праулене касы узаемадапамогі павінна выконваць свой прамы абавязак—сабраць пазыку не пазней, чым за шасцімесячны тэрмін з дня яе выдачы.

З. ЗАМАНАЎ.

МАЕ УРАЖАННІ АБ КАЛГАСЕ „РАСВЕТ“

Наведаць вядомы беларускі калгас «Расвет» мы марылі дауно. Паехаць туды на экскурсію нам давялося разам з групай студэнтау IV курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры.

У гэтым калгасе мне спадабалася усё: дамы, якія утапаюць у зелені, садах, добра наладжаная сельская гаспадарка і асабліва—людзі. Гаспадары сельгасарцелі прынялі нас вельмі ветліва. Старшыня калгаса тав. Арлоускі расказау аб гісторыі стварэння калгаса.

Нам спадабалася арганізацыя працы у калгасе. Тут няма ні перадавой, ні адсгаючай брыгады. Усе яны працуюць дружна, дапамагаючы адна другой.

Мы наведалі калгасныя фермы. Трэба прызнацца, што ніколі раней я не бачыла такіх кароу, як у калгасе «Расвет».

Калгас «Расвет» — гэта сапрауды выдатная сельгасарцель.

Люба ФІЛІПІК;
студэнтка з Польшчы.

На здымку: студэнты у калгасе.

Рэдактар А. ВОЛК.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, Біякорпус, 62, тэл. 2-07-19

ТА 01537 Друкарня выдавецтва БДУ. Зак. 698. Тыраж 2000